■ СІЛА СТВАРЭННЯ

# Уладзімір ЦЕРАБУН: "Прызначэнне мастака – зафіксаваць час праз свой погляд і творчыя магчымасці"

**У Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы "Знайсці сябе". Выстава прысвечана 50-годдзю творчай дзейнасці заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Ганаровага грамадзяніна Смаргонскага раёна, скульптара, графіка і мастака Уладзіміра Церабуна.**



Уладзімір ЦЕРАБУН ля Сымона-музыкі.

"2023 год для нашага вядомага земляка – знакавы на юбілейныя даты: 70 год таму маленькі Валодзя стаў першакласнікам, 55 гадоў таму – паступіў у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, а 50 гадоў таму пачалася яго творчая дзейнасць, – адзначыла вядучая імпрэзы Вольга Самаркіна.

Дарэчы, першая праца маладога скульптара – мемарыяльна-архітэктурны комплекс "Дальва" – была адзначана прэміяй Ленінскага камсамола БССР.

"У першую чаргу рабі тое, што дае асалоду жыцця, што пасля цябе застанецца людзям...", – жыццёвае крэда Уладзіміра Церабуна. Майстра ўвесь час свае словы пацвярджае працай.

"Выстава "Занайсці сябе" мае канцэптуальны характар. На ёй працэнтаў 80 – гэта мае работы, якія захоўваюцца ў фондах Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея, – зазначыў Уладзімір Васільевіч. – Перш за ўсё мне самому хацелася паглядзець іх. У якім стане яны цяпер, што сабой гэтыя работы ўяўляюць, бо перадаваліся музею яны на працягу больш чым 30 гадоў. Калекцыя аказалася даволі значная: гэта і партрэты-бюсты, ранія акварэлі, скульптурныя кампазіцыі, кераміка. Вельмі парадавала мяне кераміка: такога ўзроўню якасці і пластыкі я зараз ужо не магу дабіцца. Ёсць проста выключныя работы".

І да гэтай калекцыі вельмі арганічна далучаюцца малюнкі, фігуратыўныя кампазіцыі стану чалавека, дынамікі, статыкі, напружання цела і спакою. "Канешне, гэта стваралася не без уплыву вялікіх майстроў мастацтва, але ўсё ж гэта свае знаходкі", – удакладніў Уладзімір Церабун. Дарэчы, гэтым малюнкам каля 40 гадоў, што надае ім вартасці.

Упрыгожвае выставу дробная пластыка, якая заўсёды цудоўна дапаўняе графіку. Да партрэтаў-бюстаў дадаецца алейны жывапіс і акварэлі. Нібыта бласлаўляе ўсю выставу Апостал Пётр, што размясціўся ў пачатку экспазіцыі. У цэнтры залы – кампазіцыя Сымон-музыка – як сімвал выставы.

На подыуме – новыя керамічныя вазы, што пацвярджае пошук новых твораў і бязмежнасць мастацтва. Асобна ў другой зале размясціліся няздзейсненыя праекты. "Гэта маё бачанне, што магло б існаваць у манументальным мастацтве сёння. Гэта і знакамітыя постаці нашых сучаснікаў – Максіма Багдановіча, Адама Міцкевіча, Міхала Клеафаса Агінскага, Якуба Коласа, Янкі Купалы, асобныя кампазіцыі: "Лава Напалеона", "Свята ўраджаю", "На Купалле", "Трубяць трубы Гарадзенскія" – тэмы памяці і нашай гісторыі.

Увогуле, выстава мае не толькі эстэтычнае прызначэнне, але нясе сваю гісторыю і мой погляд на сусвет, вызначае прызначэнне мастака – зафіксаваць час праз свой погляд і творчыя магчымасці", – адзначыў Уладзімір Церабун.

**Выстава пацвярджае, што творчасць мае вынікі там, дзе існуе пошук "Знайсці сябе". Наведванне музея – цудоўная нагода для сустрэчы, магчымасць убачыць прафесійныя творы мастацтва, наблізіцца да майстэрства і таленту, якія спалучаюцца ў асобе аднаго чалавека. Выстава будзе працаваць да 22 кастрычніка. Дарэчы, некаторыя работы жывапісу і керамікі, выкананыя майстрам нядаўна, наведвальнікі могуць набыць.**

**Галіна АНТОНАВА.**
**Фота аўтара.**



Госці вечарыны каля экспазіцыі.